*УДК 94:133.4(476.2)«18/20»:63*

**У.А. Ганчар**
Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Ф. Скарыны

**ЗНАХАРСКАЯ ПРАКТЫКА Ў СФЕРЫ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ Ў БЕЛАРУСКІМ ПАЛЕССІ Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ**

*У атыкуле разглядаецца знахарская практыка ў сферы сельскай гаспадаркі ў Беларускім Палессі ў канцы XIX – пачатку XXI ст. Аўтар прыходзіць да заключэння, што ў знахарскай практыцы сельскагаспадарчыя функцыі «знаючых» з'яўлялісяаднымі з важнейшых і традыцыйна засяроджваліся вакол найбольш важных заняткаў насельніцтва: вырошчвання збожжавых культур і развядзення буйной рагатай жывѐлы. Робіцца вывад аб зменах сельскагаспадарчых функцый знахароў пад уплывам мадэрнізацыі грамадства ў бок іх скарачэння, пачынаючы з 1930-х гг. Вынікам гэтага становіцца паступовае звужэнне знахарскіх функцый на працягу сярэдзіны – другой паловы XX ст. і захаванне ў знахарскай кампетэнцыі ў пачатку XXI ст. пераважна лячэння жывѐлы ад хвароб, якія, па агульнаму меркаванню, навуковай медыцынай не лечацца.*

Сельскагаспадарчыя заняткі складалі асноўву жыццезабеспячэння традыцыйнай культуры беларусаў, асноўная маса якіх на мяжы XIX – XX ст. пражывала ў сельскай мясцовасці. Неўраджай ці падзѐж свойскай жывѐлы (не лічачы больш дробных праблем) з'яўляліся галоўнай пагрозай існаванню сялянскай гаспадаркі як самастойнай эканамічнай адзінкі. Адсюль і імкненне сялян забяспечыць ураджай, а таксама здароўе і пладавітасць жывѐлы любымі спобамі, у тым ліку і магічнага характару. Значную частку рытуалаў, накіраваных на забеспячэнне дабрабыту гаспадаркі, выконвалі непадрэдна ў межах сям'і. Аднак значная частка рытуалаў у сельскагаспадарчай сферы здзяйснялася «*знаючымі*», якія, па прычыне меркаванай наяўнасці сувязяў са звышнатуральнымі сіламі, маглі, па агульнаму ўяўленню, уздзейнічаць на ўсе сферы жыцця чалавека (у тым ліку на сельскую гаспадарку) як у станоўчым, так і ў адмоўным кірунках. Знахарскія функцыі ў сферы сельскай гаспадаркі займалі адно з важнейшых месцаў у знахарскай практыцы. Пры гэтым на працягу XX ст. у беларускім грамадстве адбыліся значныя змены, якія закранулі і сацыяналь-эканамічны бок яго жыцця. У гэты перыяд, спачатку ў сувязі з калектывізацыяй, а потым (як наступства індустрыялізацыі) масавай урбанізацыяй, адбываецца разбурэнне ранейшай сітэмы вядзення гаспадаркі асобных сялянскіх сем'яў і пераход да калгаснай сістэмы, а потым і падзенне значэння сельскагаспадарчых заняткаў у жыцці насельніцтва. У той жа час знахарства працягвае функцыянаваць і карыстацца попытам сярод значнай часткі насельніцтва рэгіѐна.

61

Артыкул мае на мэце разгледзець знахаскую практыку ў сферы сельскай гаспадаркі ў Беларускім Палессі ў канцы XIX – першай трэці XX ст. і прасачыць змены ў гэтай галіне ў на працягу сярэдзіны XX – пачатку XXI ст. Першыя звесткі аб дадзеным пытанні сустракаюцца ўжо ў работах этнографаў і фалькларыстаў, якія вывучалі рэгіѐн, пачынаючы з другой паловы XIX ст., напрыклад, П.У. Шэйна, М. Федароўскага, Ч. Пяткевіча. У асноўныя гэтыя звесткі прадстаўлены ў кантэксце больш шырокіх тэмаў. Асобна можна выдзеліць невялікую работу А.К. Сержпутоўскага «Завіткі» [1], у якой аўтар падрабязна апісаў адзін з прыкладаў сельскагаспадарчай магіі ў беларусаў Палесся. У больш позніх публікацыях звесткі па тэме таксама прыводзяцца ў кантэксце асноўнай праблематыкі даследаванняў і закранаюць перыяд да 1930-х гг. Змены, якія адбыліся са знахарскімі функцыямі ў галіне сельскай гаспадаркі ў пазнейшы час, у навукой літаратуры фактычна не разглядаюцца.

Для таго, каб зразумець знахарскія фукнцыі ў галіне сельскай гаспадаркі, а таксама

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

далейшую эвалюцыю ў дадзенай сферы, неабходна спачатку разгледзець дыферэнцыяцыю саміх знахароў, якія падзяляліся на розныя тыпы на аснове менавіта іх фукнцыянальнай спецыялізацыі. Гэтая спецылізацыя, у сваю чаргу, грунтавалася на мяркуемых, па агульнаму ўяўленню, крыніцах іх звышнатуральнай сілы, якая давала ім магчымасць уздзейнічаць на існы парадак рэчаў. На гэтай аснове мы можам выдзеліць два асноўных тыпа знахароў: «*шаптуны*» і «*знахары*» [падрабязней: 2]. Звышнатуральныя здольнасці «*шаптуноў*», як лічылі, грунтаваліся на веданні замоў, з дапамогай якіх яны маглі нібыта выклікаць (гэтая здольнасць характарызавалася як «*Божы дар*») Бога, анѐлаў, апосталаў, святых (прысутнасць якіх хоць і не была заўважнай непасрэдна ў момант здзяйснення імі рытуалу), займаліся лячэннем хвароб чалавека і жывѐлы, якія былі выкліканы нібыта ўздзеяннем ненаўмыснага чараўніцтва (да хвароб жывѐлы гэтай групы адносіліся («*урокі*», «*прыстрэк*», «*падвей*») ці былі вынікам натуральных прычын («*аб'ядзенне*», «*жуйка*», «*бяльмо*», «*скулюга*», «*жаба*», «*пералогі*») і бытавых траўмаў («*звіх*», «*удар*», крывацѐк, змяіны ўкус). Таксама «*шаптуны*» (ці «*шаптухі*», бо менавіта жанчыны складалі большасць «*знаючых*» дадзенага тыпу) запрашаліся ў якасці —*баб-павітух*   і практыквалі некаторыя віды варажбы (якая не патрабавала ўсталявання непасрэднага кантакту са звышнатуральнымі сіламі) [падрабязней аб функцыях «*шаптуноў*» глядзі: 3, с. 25–26].

Як бачна, у сферы сельскай гаспадаркі функцыі «*шаптуноў*» былі засяроджаны на лячэнні жывѐлы, пераважна, кароў і коней. Як адзначаюць інфарманты А.К. Сежпутоўскага: «*Часто хворае говядо баба пошэпчэ-пошэпчэ, тры разы плюне, дасць яму сілком у горло сырое яйцо, абалье халоднаю вадою да ляпне трэйко по задніцы – от яно й выздаравее*» [4, с. 82 (№ 592)]. Інфарманты аўтара падкрэсліваюць, што гэта лячэнне такіх хвароб з'яўляецца менавіта прэрагатывай «*шаптуноў*»: «*У нас у кожнуй вѐсцы знайдзецца такая баба, каторая хутко ўмее атхадзіць ат урокаў ці падзіву, бо тут не трээ знацца з нечысцю, а толькі ведаць, якія прымхі проціў чаго памагаюць да якія шэпты трээ калі шаптаць. А бабы на гэтае вельмі здолны*» [4, с. 224 (2018)].

Акрамя гэтага, у якасці фукнкцый «*шаптуноў*» у сельскай гаспадарцы згадваецца абарона пасеваў ад птушак, а таксама «*адвядзенне хмар*». Птушак, якія аб'ядалі зерне збожжавых, а таксама іншых раслін, разглядалі як пагрозу будучаму ўраджаю. Часам іх прысутнасць разглялалі як выпадковую, але ў іншым сітуацыях іх з'яўленне разглядалася як мэтанакіраванае, асабліва ў выпадках калі птушкі не жадалі злятаць з поля, нават калі іх адганялі. Як адзначае Ляхавец Іван Макаравіч (1926 г.н., в. Дуброва Лельчыцкага раѐна Гомельскай вобласці): «*І нападуць, і нападуць, і до того, што возьму прогоняю з етого места, яны ў другое, з той стороны*» [5, арк. 40]. У гэтым выпадку магчымым выйсцем з сітуацыі з'яўлялася запрашэнне «*шаптуна*», каб той прагнаў птушак. «*Адвядзенне хмар*» якое рабілася з мэтай ці адвесці, ці разагнаць градавую хмару, якая магла нашкодзіць пасевам, таксама часам здзяйснялася «*шаптунамі*». Тут неабходна адзначыць, што магічныя спосабы абароны пасеваў ад птушак і «*адвядзення хмар*» былі шырока распаўсюджаныя і выдомыя практычна ў кожнай гаспадарцы. Да «*шаптуноў*» звярталіся пры нагодзе,



напрыклад, калі яны жылі побач, ці з імі былі ў добных адносінах. Калі ж самастойна ці з дапамогай «*шаптуноў*» выгнаць птушак не атрымоўвалася, то лічылася, што гэта ўжо вынік чыйгосьці «*уздзеяння*» і неабходна звяртацца да другога тыпу знаючых – «*знахароў*»

Тут неабходна сказаць некалькі словаў аб суадносінах функцый двух тыпаў «*знаючых*», якія ў шэрагу сфер не былі строга падзеленыя і перасякаліся. Напрыклад, у крыніцах адзначаюцца выпадкі, калі «*шаптуны*» выконвалі такія функцыі «*знахароў*» як «*зацінанне*» ці спыненне пажару [6, с. 137], а «*знахары*» лячылі «*крыксы*» [7, с. 416]. Пры гэтым у кожнага тыпу «*знаючых*» існавалі ўласныя спосабы ўздзеяння. Напрыклад, для спынення пажару «*шаптуны*» выкарыстоўвалі ікону Багародзіцы «Неапалімая Купіна», з якой абыходзілі вакол пажару і замаўлялі агонь. Валасенка Ева Рыгораўна (1928 г.н.,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

в. Новыя Юркавічы Брагінскага раѐна. Нарадзілася ў в. Стары Макрэц Брагінскага раѐна) так апісвае гэта: «*Ну од пожара нада тая, етая ж, як яе, я ўжэ й цяраюся…, вікона Неапалімая Купіна. Ну, малітву тожа перамаліцца, вот еслі ўжэ пажар, вот ѐн куды-небудзь вецер ўжэ туды цягне, і кругом абыйдзі, напраў яго, і ѐн пойдзе туды вецер, і ўсѐ, тады пацягне туды*» [5, арк. 125]. З другога боку, лічылі, што «*знахары*» для спынення пажару выклікалі нячыстую сілу. У такіх выпадках за «*знахарамі*» часцей за ўсѐ былі замацаваныя больш цяжкія здарэнні, ці калі дапамога «*шаптуноў*» была безвыніковай. Ч. Пяткевіч зафіксаваў наступнае выказванне беларусаў Рэчыцкага павета аб лячэнні ад укусаў змей: «*Як серая або рудая гадзюка* (Vipera chersea) *укусіць, то й баба адшэпча, і якое-небудзь зельле паможа, а як жа, не давядзі Госпадзі, чорная, то бэз знахара ніхто і нішто не дась рады*» [8, с. 317]. Паколькі «*знахары*» лічыліся мацнейшымі за «*шаптуноў*», то маглі выконваць і іх функцыі. Аднак на практыцы да «*знахароў*» з праблемамі, якія адносіліся да функцый «*шаптуноў*», звярталіся рэдка. Гэта тлумачыцца як эканамічнымі прычынамі (дзейнасць «*знахароў*» узнагароджвалася ў большым памеры чым практыка «*шаптуноў*»), так і страхам перад магчымымі наступствамі звяртання да «*знахароў*» па дапамогу. Напрыклад, існавала павер'е, згодна з якім нячыстая сіла патрабуе ад «*знахароў*» аплату за дапамогу, якая магла выражацца ў тым ліку і ў выглядзе жыцця кожнага №-га пацыента, які ў выніку паміраў. Інфармантка з вѐскі Касцюковічы Мазырскага раѐна адзначае: «*Ёна* [«*знахарка*». – *У.Г.*] *чертьмі заведуе. На сотого попадешься* [г.зн. будзеш сотым па ліку], *дак ўтопішься: сотого она сдае* [нячыстым – па дамове]» [9, с. 79]. Інфармант А.К. Сержпутоўскага паведамляе, што «*знахар*» мае ўладу над тым, каго лячыў: «*Нашы жанкі часто самі ходзяць к ведзьмам ці чараўніком на параду, як каровы не даюць малака ці з імі зробіцца якое-небудзь другое ліхо. Чараўнікі тагды хаць атрабляюць, але на потым яны маюць моц над тым гаўядам*» [4, с. 85]. Сфера «*знахароў*» (іншыя назвы: «*чараўнік*», «*вядзьмар*», «*чарнакніжнік*») была больш шырокай. Гэта тлумачыцца тым, што крыніцый іх магічнай сілы лічылі нячыстую сілу і надзялялі іх вялікай магутнасцю, здольнасцямі ўплываць на існуючы парадак рэчаў у прыродзе і соцыуме, разумець і ведаць мову жывѐл і птушак, а таксама прымаць аблічча розных жывѐл, раслін, а таксама неадушаўлѐных прадметаў. Беларусы Мазырскага павета казалі А.К. Сержпутоўскаму: «*Як знайдуць на полі такую заламку ці куклу, та спужаўшыся хучэй шукаюць моцных чарадзейнікаў, каб яны атрабілі. Часам завуць і папа, каб ѐн атрабіў. Але поп рэдко памагае, хаць ѐн і моліцца Богу, бо ліхое й Бога перамагае*» [4, с. 265]. У в. Ручаѐўка Лоеўскага раѐна зафіксаваны тэкст, згодна з якім Бог разам з апосталамі Пятром і Паўлам засталі ў полі «*знахарку*» падчас завівання «*завіткі*». Бог, у якасці пакарання, загадаў ѐй не разгінацца, на што «*знахарка*», ў сваю чаргу, замовіла, каб Бог не ўзышоў на неба. У выніку праз тры гады Хрыстос зноў прыйшоў да «*знахаркі*» і сказаў, каб тая разагнулася. «*Знахарка*» таксама зняла сваѐ закляцце, і Хрыстос «*пашоў на небеса*». Інфармантка скончыла аповед наступнымі словамі: «*Ана перамагла Бога. Бога перамагалі черты*» [10, с. 127–128]. Асноўнымі функцыямі «*знахароў*» былі ўздзеянне на навакольны свет і соцыум у станоўчым і адмоўным кірунках і варажба. Аб важнасці першай функцыі сведчыць распрацаваная тэрміналогія, якая выражалася ў антонімах: «*зачараваць*» – «*адчараваць*», «*зрабіць*» – «*адрабіць*». Беларусы Мазырскага павета лічылі, што «*ведзьмары, ведзьмы да*



*чарадзейнікі робляць усялякія рэчы, гамоняць загаворы й такім чынам зачароўваюць людзей, гаўядо да ўсялякае жыўѐло, расліну й нават могуць так зачараваць, што стрэлба не страляе, або жывіць, ці што-небудзь іньшае. Як хто ачаруе, та трээ шукаць мацнейшага чараўніка, каб ѐн атрабіў ці вярнуў тое зачараванне на таго самого чараўніка ці ведзьмара, які тое прырабіў*» [4, с. 264]. Амянчук Аляксандра Паўлаўна (1935 г.н., в. Моладава Іванаўскага раѐна) адзначае: «*Знахоры от казалы ў нас, на Бусы была такая Тэкля знахірка, от тая могла нешо зробыты і одробыты*» [5, арк. 107]. Таму не дзіўна, што ў знахарстве Беларускага Палесся ў сферы сельскай гаспадаркі асноўная роля належала менавіта «*знахарам*».

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

У першую чаргу гэта тычыцца земляробчай галіны. Лічылі, што «*знахары*» маглі «забраць» ураджай шляхам завівання завітак і так званых «*абжынаў*» ці «*адрабіць*» гэта. Згодна з Ю. Крачкоўскім, сяляне Кобрынскага павета лічылі, што «*знахары*» робяць «*абжыны*», абыходзячы голымі з сярпом і зразаючы жыта па краям поля падчас яго «*красавання*», а потым кладучы зрэзаныя каласы да сябе ў клець. Лічылі, што такім чынам падчас жніва сотая частка сабранага гаспадарамі такіх ніў зерня магічным чынам перамяшчалася да «*знаючага*», які зрабіў гэты абжын [11, с. 143].
Завіткі ж часцей рабіліся з мэтай навесці хваробу ці смерць на канкрэтнага чалавека ці ўсю сям'ю, хатнюю жывёлу ў гаспадарцы. Як адзначае А.К. Сержпутоўскі: « Заламкі маюць некалькі відаў. Дасведчаны —вядзьмар ці —вядзьмак па знешняму выгляду —завіткі даведваецца, якое ад яе можа быць няшчасце» [1, с. 1]. Інфармантка з вѐскі Вялікі Бор Хойніцкага раѐна паведамляе: «*Завіткі ўюць у хлебі – і бабы і мужчыны ўмэлі рабіць. Йім пячэ, знахаром, подласьць людзям зрабіць. Нарабляя чалавеку знахарка: ўудахня ўся худоба ці ўся сям'я да аднаго чалавека, бабі адной галаву зьвярнула на патыліцу – жыта каласкоў дзесяць паскруціць, пазаламуя на ўсход ці на заход, красную гарыну, а не сураўую нітку наўязуя. Гарына – ніткі красныя і чорныя, колісь ўушывалі палаценцы. Знахор мог і атрабіць*» [12, с. 100].
Само па сабе знаходжанне завіткі на полі ўжо лічылі няшчасцем, аднак яшчэ горш было, калі хто-небудзь зжынаў яе. Дакрананне да завіткі нібыта актывізавала яе шкоднае ўздзеянне. Чалавек, які да яе дакрануўся (часцей гэта былі жнеі, якія, падчас цяжкай працы, не заўсѐды маглі яе заўважыць), амаль гарантавана павінен быў захварэць ці памерці (у залежнасці ад таго, з якой мэтай завітка была зроблена). Таму, знайшоўшы завітку, яе стараліся не чапаць, а знайсці «*знахара*», каб той яе вырваў. П.В. Шэйн адзначае аб беларусах Мазырскага павета: «Мая апавядальніца, якая сама захварэла раз ад завіткі, зробленай на полі яе сям'і, распавяла мне аб гэтым наступнае: знахар, зняўшы з яе галавы хусту, паклаў яе, калі лѐг спаць, сабе пад галаву. Прачнуўшыся на другі дзень рана, ѐн распавѐў, хто менавіта зрабіў завітку. Затым ѐн загадаў ѐй прынесці вады ў бутэльцы і маліцца перад абразамі, трымаючы яе ў руках і ўсѐ *гукаючы ў яе*. Затым з гэтай бутэлькі ѐн даў ѐй выпіць трохі вады, ад чаго яна быццам бы і папраўлілася. Саму ж завітку знахар вырваў і, правязаўшы да камня, кінуў у ваду. Часта завітку знахары кладуць у труну нябожчыку. У першым выпадку віноўнік завіткі павінен патануць, а ў другім памерці заўчаснай смерцю» [13, с. 233]. Неабходна адзначыць, што «*завіткі*» часта рабіліся з мэтай пажартаваць, напалохаць ці нават проста з мэтай атрымання прыбытку. У крыніцах неаднаразова згадваецца, што «*знахары*» самі рабілі «завіткі», каб потым ім плацілі за іх выраванне [напрыклад: 1, с. 4; 8, с. 491–492].
Таксама, пашкодзіць ураджаю «*знахары*» маглі, нібыта ўплываючы на надвор'е і розных жывѐл. Па словах інфарманта М. Федароўскага, знахары маглі наслаць на палеткі і хаты хмары, дождж і град, а таксама жаб, вужоў і пацукоў: «*Усяка ведзьма, як ѐй пара надыдзе, можа на сяло града ці сушаю наслаць, або можа на хату жабамі або вужамі наслаць, і ніяк не можна ад іх адагнаца, усяк смаліцаю лезуць*» [14, с. 81–82, 102; 7, с. 82–83, 296–299, 332–410]. «*Знахары*» нібыта маглі і нейтралізаваць негатыўнае ўздзеянне ў гэтай сферы. Ч. Пяткевіч прыводзіць наступныя словы свайго інфарманта: «*Даўней, бывала, як развядзецца надта многа ўсякае нечысьці, быццам то за тое, што на сяле то той, то сѐй*

*убіў ката, чы можа затым, што на катоў напала лянота, да не ловяць мышэй, то знахар выведзе*» [8, с. 336].
Да функцый «*знахароў*», як ужо адзначалася вышэй, магла адносіцца таксама абарона ад птушак пасеваў збожжавых раслін у тым выпадку, калі ўласныя намаганні гаспадароў прагнаць птушак былі марнымі. У такім выпадку лічылі, што нехта «*зрабіў*» і неабходна клікаць «*знахароў*», каб тыя «*адрабілі*».
РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Важнай з'яўлялася роля знахароў і ў сферы жывѐлагадоўлі. Хаця ў крыніцах зафіксвана інфармацыя аб уключанасці ў практыку «*знахароў*» фактычна ўсіх відаў жывѐлы, якая мелася ў сялянскай гаспадарцы рэгіѐна, аднак актыўнасць прымяняльна да асобных яе відаў была рознай і вар'іравалася ў залежнасці ад ступені значнасці жывѐлы ў хатняй гаспадарцы. Знахарская практыка пераважна была сканцэнтравана вакол кароў і, ў меньшай ступені, коней і авечак; усе астатнія віды жывѐлы значна саступаюць ва ўвазе. Паводле традыцыйных уяўленняў лічылі, што «*знахары*» могуць пашкодзіць свойскай жывѐле, насылаючы на яе нячыстую сілу, драпежных жывѐлаў, хваробы. Інфармантка з хутара Падомша Столінскага раѐна адзначае: «*З ночы короўа мокра.* <…> *Гоўорать, есь такая ласіца, она злезэ на короўу і шлокочэ еѐ. Ўэдьма наслала*» [15, с. 385]. «*Адрабіць*» у гэтым выпадку мог іншы «*знахар*». А.К. Сержпутоўскі прыводзіць наступнае выказванне свайго інфарманта: «*Як говядо захварэе, та перш-наперш робляць усялякія прымхі, якія знаюць самі, а калі й тое не памагае, та тагды ўжэ стараюцца знайсці такіх знаючых людзей, каб яны атрабілі. Але не ўсе знаюць роўно: адны больш, другія менш. Трэба знайсці чараўніка мацнейшага, каб ѐн атрабіў*» [4, с. 81]. Юшкевіч Марыя Андрэеўна (1927 г.н., в. Сярэднія Печы Лельчыцкага раѐна) распавяла як «*зрабілі худобі*», падкінуўшы нейкую костку: «*У нас дажэ косць* (нехта падкінуў костку. – *У.Г.*), *худоба дохла, сягоння то ў нас шыферам крыюць, хлявы й хаты, а раньшай жа саломай крылі, то туды ў кулѐк у салому ўвапхне, і худоба дохла кожны год, кожны год дохла. То ўжэ прывезлі тога знахара, ѐн сам із Ліплян, да прывезлі, да он ту костку вуйме, да ўжэ забірае з сабою, да й нясе, да вязе. Да ўжэ скажа на яке ўрэм'е прыехаць, то бацька мой поедзе туды да яго, коб ѐн памог шо-небудзь, воды даў худобе, каб ня дохла*» [5, арк. 36]. Адной з прычын негатыўнага стаўлення да «*ведзьмаў*» было мяркуемае адбіранне імі малака ў кароў [7, с. 42–69]. У гэтым выпадку таксама было неабходна звяртацца да «*знахароў*», каб яны «*адрабілі*». Інфармант А.К. Сержпутоўскага паведамляе: «*Калі карова перастае даваць малако, та гэто хтось здзівіў ці ўдзеяў, а затым трэба атрабіць. Тагды йдуць к знахару ці знахорцы. Яны шэпчуць, штось выробляюць, і карова зноў дае малако*» [4, с. 85–86].

Што тычыцца астатніх жывѐл, то іх месца ў знахарскай практыцы было значна меньшым. Напрыклад, Э. Яленьска адзначае, што ў беларусаў вѐскі Камаровічы Мазырскага павета, калі не вяліся кураняты ці гусяняты, таксама запрашалі «*знахароў*» [16, с. 60]. У пэўнай ступені яно абмяжоўвалася забаронамі. Так, шырокараспаўсюджанай была забарона лячыць свіней і сабак (а некаторыя «*шаптухі*» не «*шапталі*» коням, як нычыстым жывѐлам). Напрыклад, М. Федароўскі прыводзіць звесткі аб знахары, які не «*шаптаў*» сабакам [14, с. 103].

У галіне сельскай гаспадаркі «з*нахары*» выконвалі таксама функцыі, якія мелі ахоўны характар. Перш за ўсѐ гэта тычылася жывѐлагадоўлі. Шэраг крыніц сведчаць аб існаванні ў беларусаў Палесся «спецыялістаў» па адпраўленні абраднасці першага выгану жывѐлы ў поле, які часцей за ўсѐ быў прымеркаваны да свята Юр'я веснавога (23.04 ст.ст./06.05 н.ст.). Так, М.Я. Грынблат у сваім артыкуле, прысвечаным пастухоўству на Тураўшчыне, прыводзіць наступныя звесткі з в. Тонеж (цяпер Лельчыцкі раѐн): «Юры лічыцца абаронцам жывѐлы. Ён мае сілу над ваўкамі і кіруе імі. Дзеля гэтага на Юр'я да ўсходу сонца знахары —зацінаюць  жывѐлу ад ваўкоў на ўсѐ лета. Калі знахары (а —спэцыялістых  па —зацінаньні жывѐлы ў с. Тонеж – двое) не пасьпеюць да ўсходу сонца абыйсьці ўсіх гаспадароў, то жывѐла іх застаецца не загаворанай і ѐй пагражае быць задранай ваўкамі. Вера ў —зацінаньне  вялікая. Мне расказвалі, што бачылі, як воўк езьдзіў верхам на папоўскай карове і не чапаў яе толькі таму, што яна была загаворана на Юр'я» [17, с. 71]. І.А. Сербаў



паведамляе аб беларусах Лунінецкага раѐна наступнае: «У кожным паселішчы у палян маюцца свае грамадзкія —воўхвы , якія абыходзяць вакол стада з гарашчай галавешкай і ўтвараюць заклѐны ад гада ярага, зьвера лютага і чалавека ліхога» [18, с. 68]. Аб распаўсюджанасці гэтага звычаю сведчаць прыведзеныя Ю. Крачкоўскім звесткі аб

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

беларусах Гродзенскай губерні, якія адносяцца да канца XIX ст. Згодна з імі ў многіх вѐсках гэтага рэгіѐна пры першым выгане жывѐлы ў поле «запрашаюць *знахара*, які, на думку сялян, умее *запасавать статок*, г.зн. замаўляць жывѐлу галоўным чынам ад ваўкоў» [19, с. 191]. Знахарскія абрады ахоўнага характару былі прымеркаваныя яшчэ да аднаго свята календара, на якое прыходзілася актыўнасць «*ведзьмакоў*» і «*ведзьмаў*» – Івана Купалы (23.06 ст.ст./06.07 н.с.). Абрады, якія праводзіліся ў гэты час, мелі на мэце не дапусціць змяншэння малака ў кароў, хваробы жывѐлы. Так, інфармантка з вѐскі Верхнія Жары Брагінскага раѐна адзначае: «[замаўляць трэба] – *с чужого села пріходять, так на хлебе, мак рассыпаешь, на воду говорю. Заговарівать напротіў Івана Купальныя надо.* [Калі не замовіш], *назаўтра молоко уменьшыца, а поговоріш – не уменьшыца. І крапіву трэб ў ворота затыкать*» [15, с. 387–388; 20, с. 449–450]. У канцы XIX ст. гэтая функцыя «*знахароў*» згадваецца І.І. Насовічам, які прыводзіць звесткі, што на свята Івана Купалы «некаторыя гаспадыні, па парадзе —знахароў , каб аградзіць ў гэтую ноч сваю скацінку ад нападзення ведзьмы, вешаюць над варотамі хлява стрэчанскую свечку, якая, па вераванні іх, мае моц не прапусціць ведзьму ў хлеў» [21, с. 60].
Ахоўныя функцыі «*знахароў*» у галіне жывѐлагадоўлі мелі таксама аказіянальны характар. Калі жывѐла гублялася ў лесе і не вярталася дадому, па сведчанні Э. Яленьскай, звярталіся да «*знахароў*», каб тыя з дапамогай варажбы адшукалі яе ці прымусілі ісці дадому [16, с. 66]. Каб жывѐла ў гэты час была недасяжнай для драпежнікаў, «*знахары*» рабілі «*зацінанне*», утыркаючы замоўлены нож у сцяну. Лічылі, што пакуль нож будзе тырчаць у сцяне, драпежныя жывѐлы яе не ўбачаць. «*Знахары*», якія выконвалі абрады пад час першага выгану жывѐлы ў поле, а таксама займаліся «*зацінаннем*» у іншы час, павінны былі пасціцца ў дзень св. Юр‘я: «Еслі свыння заночуе [у лесе] ці карова, ѐн (знахар – аўт.) умее іі зацінаць. Йон ў сенцах шэпчэ, шэпчэ, патом ў стену ножа забье – і карова становіцца, і ніхто іі не троне, ні воўк, ніхто. І ўзаўтра, на другій день вунимае [нож], і карова ужэ сама прійде. Есь такій празнік – Юрэй. Таму, што ѐн зацінае, полные суткі даўжон посціць, нічого ѐн не есть, дажэ і вады. Адін день ў год толькі. Ў вечэрі перэд Юрйем павечэраець, то ужэ на другій день ў вечэрі» (в. Жахавічы Мазырскага раѐна) [7, с. 426].
З 1930–1940-х гг. знахарскія функцыі ў сферы жывѐлагадоўлі падвяргаюцца значным зменам, якія былі выкліканы маштабнымі сацыяльна-эканамічнымі і культурнымі зменамі ў грамадстве. У прыватнасці, калектывізацыя сельскай гаспадаркі прывяла да хуткага знікнення многіх знахарскіх функцый па прычыне знікнення неабходных умоў іх прымянення, і як вынік іх незапатрабаванасці. Жыццѐ сялян цяпер у значна большай ступені залежала не ад ураджаю ці здароўя жывѐлы, а ад улады, якая размяркоўвала рэсурсы. Як бачна, змены закранулі перш за ўсѐ «*знахароў*», зрабіўшы непатрэбнымі многія менавіта з іх кірункаў дзейнасці, што было адной з галоўных прычын падзення іх статусу і паступовага знікнення на працягу другой паловы XX ст. На сѐнняшні дзень пераважная большасць «*знаючых*» у рэгіѐне прадстаўлена «*шаптунамі*» [падрабязней: 2]
Напрыклад, абагульненне прыватных сялянскіх надзелаў зрабіла бязсэнсоўным як завіванне «*завітак*», якія рабіліся на канкрэтнага чалавека (сям‘ю, гаспадарку), так адпаведна і іх «*адрабленне*» «*знахарамі*». Апытаныя дысертантам інфарманты лічаць, што «*завіткі*» зніклі некалькі дзесяцігоддзяў таму. Калі паглядзець запісы палявых этнаграфічных матэрыялаў за 1970-1980-я гг., то можна ўбачыць, што інфарманты кажуць аб завітках як аб адносна нядаўняй з‘яве (большасць інфармантаў выкарыстоўваюць усѐ ж мінулы час), якую яны добра ведаюць [напрыклад: 7, с. 331–410], то апытаныя аўтарам у пачатку XXI ст. кажуць аб завітках як аб з‘яве, якую яны бачылі толькі ў дзяцінстве, ці ўвогуле толькі чулі аб ѐй ад старэйшых. Так, Драцэвіч Марыя Фамінічна (1928 г.н.,

в. Баландзічы Іванаўскага раѐна), нягледзячы на сталы ўзрост, толькі чула аб «*завітках*» ад старэйшых людзей: «*Завулкі во тыі во. А я тых завулок нэ знаю. Это гынчы кажэ тэпэр нэ*
РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*робыць, колысь казалы, шчо завуўку няку ў жыто заўюць, да тэ зрабылы на хозяіна, коб хозяін умэр, а это зробылы на його сына, чы дочку, то колысь казалі. А я думаю, шо тэпэра можэ нэма такых людэй, это колысь казалы, шо есце такые люды, шо зробыць, ну, зробыць, шо будэ він хворыты, боліты, ў його то тээ болыць, то тээ болыць, да кажуць, бо на яго завуўку завэлы, ну у жытэ. Ну, а я думаю, шо такіх можэ ўжэ нэма, я тэпэр нэ чую такіх шо, каб хто кому завуўку* [зрабіў. – *У.Г.*]» [5, арк. 100]. Тыя інфарманты, якія самі бачылі «*завіткі*», адзначаюць, што гэта было яшчэ ў іх дзяцінстве. Краўчэня Галіна Ігнацьеўна (1939 г.н., в. Чырвонабярэжжа Лельчыцкага раѐна. Нарадзілася ў в. Храпунь Столінскага раѐна) хадзіла глядзець на «*завітку*» яшчэ дзіцѐм: «*Да й баба, ета ж хадзілі, то й мы ж малыя ўсе такія ту завітку глядзелі*» [5, арк. 64]. Аналагічная інфармацыя атрымана ад Маркоўскай Марыі Пракопаўны (1920 г.н., в. Маркоўскае Лельчыцкага раѐна): «*Ну завіткі то робілі, колісь, колісь, я мала була*» [5, арк. 53].

Улічваючы ўзрост інфармантаў, можна меркаваць, што гэтыя падзеі адносяцца да 1930–1940-х гг. Заяц Лукер'я Філіпаўна (1936 г.н., в. Буда-Сафіеўка Лельчыцкага раѐна) апісвае паказальную сітуацыю са стаўленнем да «*завітак*», якая адносіцца да 1950-х гг.: «*Ну робілі, гаворaць, пойдам у этат, да заўяжа што-нібудзь, а то гаворaць для смеха это зробляць. А вон бегае да крычыць. Адзін дзед такі быў, што... Вось вот хлопцы пойдуць да ў яго заўяжуць там, рож ету зўяжуць, да постаўляць. А вон гляне ето да бегае да: "О, прыробілі! Во, прыробілі ето"! А хлопцы назаўтра й гаворaць: "Это ж мы Юдзіну зрабілі ето, шоб вон бегаў і рэвеў там". А больш этого я... я етого не знаю*» [5, арк. 58]. Такім чынам, у 1930–1940-я гг. «*завіткі*» і іх ліквідацыя «*знахарамі*» хутка зніклі, хаця памяць аб іх, а ў асобных выпадках нават веданне таго, як рабіць завіткі і што пры гэтым трэба казаць, працягваюць існаваць.

Абагульненне падчас калектывізацыі буйной рагатай жывѐлы і коней і як следства змяншэнне ролі жывѐлагадоўлі ў асобных гаспадарках, а таксама змяншэнне прымхлівасці насельніцтва прывялі да знікнення многіх знахарскіх функцый у галіне жывѐлагадоўлі. Напрыклад, інфармантка з вѐскі Вялікі Бор Хойніцкага раѐна адзначыла ў 1975 г. знікненне «*ведзьмаў*», якія адбіраюць малако ў кароў: «*Цяпер не слышно етаго*» [12, с. 105]. Гэта прывяло да знікнення знахарскай функцыі «*адраблення*» жывѐлы, якая стала даваць менш малака. Па-іншаму сталі трактавацца і прычыны гэтага. Калі ў першай трэці XX ст. знікненне малака ў кароў часцей звязвалі з негатыўным уздзеяннем «*знахароў*» («*нешто зроблено*»), то ў канцы XX – пачатку XXI ст. асноўнай прычынай часцей сталі называць «*урокі*». Інфармантка з вѐскі Міхнавічы Бярозаўскага раѐна паведамляе: «*Калі ў каровы прападала малако, гаварылі, што гэта на яе напалі ўрокі*» [22]. Развіццѐ навуковай вітэрынарыі прывяло да пераходу значнай часткі хвароб жывѐлы да яе кампетэнцыі. За знахарствам засталіся пераважна хваробы, якія выкліканы нібыта звышнатуральным ненаўмысным уздзеяннем на жывѐлу (*урокі*, *зглаз*), а таксама вынікі траўматызму жывѐлы. Фактычна, паколькі знахарства ў гэты час прадстаўлена менавіта «*шаптунамі*», бачна, што знахарамі дыягнастуюцца менавіта тыя хваробы, якія адносяцца да кампетэнцыі гэтага тыпу «*знаючых*». Напрыклад, Крывалевіч Вольга Цітаўна (1932 г.н., в. Альманы Столінскага раѐна) «*шэпча*» наступныя хваробы жывѐлы: «*подвой і ўрокі ўмею коровам шаптаць*» [5, арк. 115]. Аднак у пачатку XXI ст. адбываецца прыкметнае зніжэнне значэння дадзенага віду знахарскай дзейнасці па прычыне скарачэння ў апошнія гады колькасці жывѐлы, якую трымаюць у прыватных гаспадарках.

У 1930–1980-я гг. знікаюць знахарскія функцыі ахоўнага характару, якія выкарыстоўваліся пры першым выгане жывѐлы ў поле. Найбольш позні запіс такога абраду зафіксаваны ў 1984 г. у вѐсцы Верхні Церабежаў Столінскага раѐна. Адзначаецца, што інфармант сам па запрашэнні гаспадароў праводзіў гэты абрад «да нядаўняга часу» [20, с. 528–529]. Такім чынам, абрад у дадзеным населеным пункце перастаў праводзіцца да 1980-х



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гг. На гэта, акрамя змяншэння ролі жывѐлагадоўлі ў асобных гаспадарках, паўплывала нежаданне, а часта супраціў моладзі выконваць старыя звычаі. Семіход Марыя Антонаўна (1928 г.н., в. Губічы Буда-Кашалѐўскага раѐна Гомельскай вобласці. Да 1986 г. пражывала ў в. Міхалѐўка Брагінскага раѐна) апісвае падобную сітуацыю ў сваѐй сямʼі: «*Мая свякруха, баба Серахвіма, калі яна худобу выганяла, то клала сякеру ды замок, замок во, якім замукаюць. Дык і я так раблю, і ў мінулы год так рабіла. Дык а нявестска ж не хоча, дык я ціхенька. Во пакладу так, каб не паранілася*» [5, арк. 1].

Адпаведна знахарская дзейнасць у лячэнні іншых відаў свойскай жывѐлы мае яшчэ меньшае значэнне і носіць выпадковы характар. Напрыклад, Кананец Раісу Паўлаўну (1927 г.н., в. Стрэльна Іванаўскага раѐна) аднойчы запрашалі «*пашаптаць*» індыкам «*урокі*»: «*А колысь да індюкы ў нас тут булы, да отдыхалы, шчэ тылько отдыхалы, я зайшла, а як раз пэрэд Паскыю да пырогы пэчы, а воны прытулылыса машыною: "Ходы, бабо, ходы". Я кожу: "Куды я пойду, – кажу, – мнэ нэма колы". А воны ж завэзлы туды. А я поговорыла, дак кілько зостало, кілько всі і осталыса*» [5, арк. 88]. Стасенка Юлія Андрэеўна (1939 г.н., в. Буйнавічы Лельчыцкага раѐна. Нарадзілася ў в. Скароднае Ельскага раѐна) «*шаптала*» сабакам ад змяінага ўкуса: «*У нас дажэ ў нашым гародзе, там ваенные стоўба закопвалі і коло того стоўба два собакі нашыя былі, і брацья і двух укусіла, гадзіна! Во одзін прыйшоў, вооо такііі во, і другі ўжэ йдзе, ту за грудзькі ўкусіла, той маленькі быў пошэптаць, той вялікі быў сабака. А я пошэптала і яны назаўтра поодтухалі*» [5, арк. 73].

Пры гэтым некаторыя інфарманты працягваюць у сваѐй практыцы кіравацца забаронамі «*шаптаць*» пэўным жывѐлам. Напрыклад, Барысавец Марыя Якаўлеўна (1937 г.н., в. Баравое Лельчыцкага раѐна. Нарадзілася ў в. Люболі Лельчыцкага раѐна) не можа лячыць свіней і коней, паколькі: —*Коровам гомоняць, а сьвінням не гомоняць, і коням не гомоняць. А гэта, як Сус Хрыстос, як быў чудо етае, дак іх было дванаццаць вучыцелей, да одзін там казалі здаў чы не здаў, да жонку пуд корыто заховаў, да ўжэ пытае Ісуса Хрыста: "Як ты ўгадаеш, шо под корытом, то тады я ўзнаю, шо ты Сус Хрыстос". Да, а ѐн кажэ, шо неўгадаеш. А вон ка: "Ўгадаю". А вон ка: "Ну шо, – кажа, – сьвіння с поросяцьмі". А оны одкрылі, і праўда, сьвіння. Дак того ж жыды сала не ядзяць. І коням не. Ісус Хрыстос Божа Маці родзіла ў яслях, тамако, дзе даюць коням есьці, да вона там захаваласа, да коні, да коні ўсе паелі сено. Да яе ж там няслі ў тых яслях, Божу Мацер, Сус Хрыстос, то тым коням тожа не гавараць* [5, с. 67].

У разглядаемы перыяд паступова знікаюць і іншыя знахарскія фукнцыі, хаця прычыны гэтага могуць быць рознымі. Напрыклад, у канцы XX – пачатку XX ст. інфарманты больш не кажуць аб запрашэнні знахароў для таго, каб адагнаць пацукоў, мышэй, прусакоў, птушак. Безумоўна прычынай гэтага зʼяўляецца як эфектыўнасць сучасных сродкаў барацьбы са шкоднікамі, так і змена крыніц жыццезабеспячэння ў сучаснай сельскай мясцовасці. Хаця пэўныя інфарманты і валодаюць ведамі таго, як замаўляць мышэй, варабʼѐў, і выкарыстоўваюць гэтыя веды спарадчна для сябе. З іншага боку, на знахарскую практыку ў сельскагаспадарскай сферы аказвае ўплыў (як і на знахарства ўвогуле) і хрысціянскі светапогляд (у шырокім сэнсе). Напрыклад, у канцы XX – пачатку XXI ст. частка інфармантаў адмаўляецца вучыцца замовам для разгону градавых хмар, паколькі лічыць гэта чараўніцтвам. Напрыклад, Крывалевіч Вольга Цітаўна (1932 г.н., в. Альманы Столінскага раѐна) на пытанне ці ўмее яна разганяць хмары адказала: «*Не. Я не хочу ўрэдзіць, і нічого я такога не знаю*» [5, с. 115].

Такім чынам, знахарскія функцыі ў сферы сельскай гаспадаркі на тэрыторыі Беларускага Палесся зʼяўляліся, побач з лячэннем людзей, найбольш важнымі у занахарскай практыцы. Важнасць канкрэтных з іх залежала ад значнасці пэўнага рэсурса ў сялянскай гаспадарцы. Так, у першай трэці XX ст. знахарская практыка канцэтравалася вакол збожжавых раслін і буйной рагатай жывѐлы, якія зʼяўляліся крытычна неабходнымі для выжывання сялянскай гаспадаркі. З 1930-х гг. адбываецца істотная трансфармацыя знахарскіх функцый у гэтым кірунку, што было звязана з маштабнымі сацыяльна-эканамічнымі пераўтварэннямі,

РЕПОЗИТОРИЙ ГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

якія прывялі да знікнення ранейшай сістэмы гаспадарання. У выніку многія знахарскія

функцыі ў гэтай сферы сталі незапатрабванымі, што прывяло да іх паступовага знікнення. У канцы XX – пачатку XXI ст. знахарская дзейнасць у гэтай сферы засяроджана ў асноўным вакол лячэння жывѐлы (перш за ўсѐ, буйной рагатай) ад хвароб, якія, паводле агульнапрынятых уяўленняў, не паддаюцца лячэнню навуковай ветэрынарыяй, і нібыта з'яўляюцца вынікам ненаўмыснага звышнатуральнага ўздзеяння.

**Крыніцы і літаратура**

1. Сержпутовский, А.К. О завитках в Белоруссии: очерк из жизни крестьян южной полесской части Слуцкого уезда, Минской губернии / А.К. Сержпутовский. – СПб. : Т-во И.Н. Кушнерев и К. Тип. М-ва путей сообщенения, 1909. – 6 с.
2. Ганчар, У.А. Тыпы «знаючых» у Беларускім Палессі і іх змены ў XX – пачатку XXI ст. / У.А. Ганчар // Весці Палесскага дзяржаўнага універсітэта. Сер. грамад. і гуманітар. навук. – 2011. – № 1. – С. 20–26.
3. Ганчар, У.А. Накірункі знахарскай дзейнасці ў Беларускім Палессі і іх змены ў XX – пачатку XXI ст. / У.А. Ганчар // Научные труды Республиканского института высшей школы : в 2 ч. : сб. науч. ст. / под ред. В.Ф. Беркова. – Минск : РИВШ, 2011. – Вып. 11, ч. 1 : Исторические и педагогические науки. – С. 24–30.
4. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі ; навук. рэд. А.С. Фядосік ; прадм. У.К. Касько]. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 301 с.
5. Архіў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Фонд 6. – Воп. 14. – Спр. 152.
6. Ossendowski, F. Polesie / F. Ossendowski. – Poznań : Wyd-wo Polskie R.Wenger, 1935. – 202 s.
7. Народная демонология Полесья: публикации текстов в записях 80–90-х гг. XX века : в 4 т. / сост.: Л.Н. Виноградова, Е.Е. Левкиевская. – М. : Языки славянских культур, 2010. – (Studia philologica) – Т.1 : Люди со сверхъестественными свойствами / сост.: Л.Н. Виноградова, ЕЕ. Левкиевская. – 2010. – 648 с.
8. Пяткевіч, Ч. Рэчыцкае Палессе / Часлаў Пяткевіч ; уклад., прадм. У. Васілевіча; пер. з пол.. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2004. – 670 с. – (Беларускі кнігазбор: БК, Серыя 1, Мастацкая літаратура. Серыя 2, Гісторыка-літаратурныя помнікі).
9. Представления восточных славян о нечистой силе и контактах с ней: материалы полевой и архивной коллекции Л.М. Ивлевой / М-во культуры Рос. Федерации, Рос. акад. наук, Рос. инт истории искусств; сост., подгот. текстов, предисл. и справ. аппарат В.Д. Кен. – СПб. : Петерб. востоковедение, 2004. – 438 с. – (Ethnographica petropolitana; 13).
10. Белова, О.В. Библейские сюжеты в восточнославянских народных легендах / О.В. Белова // Восточнославянский этнолингвистический сборник: исследования и материалы / Рос. акад. наук, Ин-т славяноведения ; редкол.: А.А. Плотникова (отв. ред.) [и др.]. – М. : Индрик, 2001. – С. 119–150.
11. Крачковский, Ю.Ф. Быт западно-русского селянина / Ю.Ф. Крачковский ; Изд-во Имп. о-ва истории и древностей рос. при Моск. ун-те. – М. : Университет. тип., 1874. – 212 с.
12. Гура, А.В. Материалы к полесскому этнолингвистическому атласу / А.В. Гура, О.А. Терновская, С.М. Толстая // Полесский этнолингвистический сборник: материалы и исследования / Акад. наук СССР, Ин-т славяноведения и балканистики ; редкол.: Н.И. Толстой (отв. ред.) [и др.]. – М. : Наука, 1983. – С. 49–153.
13. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северозападного края, собранные и приведенные в порядок П.В. Шейном / П.В. Шейн. – СПб. : Тип. Имп. Акад. Наук, 1887–1902. – Т. 3. – 1902. – 535 с. – (Сборник Отделения русского языка и словесности Академии наук ; Т. 72, № 4).
14. Federowski, M. Lud białoruski na Rusi Litewskiej: materyały do etnografii słowiańskiej zgromadzone w latach 1877–1894: w 3 t. / M. Federowski. – Kraków : Wyd-wo Komisii

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

antropologicznej akademii umiejętności, 1897–1903. – T. 1: Wiara, wierzenia: przesądy ludu z okolic Wołkowyska, Słonima i Sokółki. – 1897. – 510 s.
15. Левкиевская, Е.Е. Материалы к словарю полесской этнокультурной лексики (опыт компьютерной обработки восточнославянской диалектной лексики). Демонология / Е.Е. Левкиевская // Восточнославянский этнолингвистический сборник: исследования и материалы / Рос. акад. наук, Ин-т славяноведения ; редкол.: А.А. Плотникова (отв. ред.) [и др.]. – М. : Индрик, 2001. – С. 379–431.
16. Jeleńska, E. Wieś Komarowicze w powiecie Mozyrskim / E. Jeleńska. – Warszawa : J. Jeżyński, 1892. – 83 s.
17. Грынблат, М.Я. Некаторыя матар‘ялы да вывучэння пастушаства і жывѐлагадоўлі Тураўшчыны / М.Я. Грынблат // Наш край. – 1928. – № 8–9 (35–36). – С. 64–71.
18. Сербаў, І.А. Вічынскія паляне. Матэрыяльная культура: этнаграфічны нарыс Беларускага Палесся / І.А. Сербаў ; падрыхт. матэрыялу да друку і прадм. Т.А. Навагродскага. – Мінск: Беларус. фонд культуры, 2005. – 78 с.
19. Крачковский, Ю. Очерки быта западнорусского крестьянина / Ю. Крачковский // Виленский сборник. – Вильна : Издал В. Кулин, 1869. – С. 160–209.
20. Полесские заговоры: в записях 1970–1990-х гг.: сб. / Рос. акад. наук, Ин-т славяноведения. – М. : Индрик, 2003. – 751 с.
21. Носович, И.И. Белорусские песни / И.И. Носович // Записки Императорского Русского географич. общ. по отделению этнографии. – СПб : Тип. Майкова, 1873. – Т. 5. – С. 45–280.
22. Фальклорны архіў кафедры беларускага літаратуразнаўства філалагічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна за 2007-2008 г.
**Uladzimir Hanchar. Charles' practices in the field of agriculture in Belarusian Palessie in the late 19 and early 21 c.** In the article is considered the sorcerous practice in the sphere of agriculture in Polesie in the end of the 19th - the beginning of the 21st century. The author comes to conclusion about importance of the sorcerous practice in region and its concentration around the main occupations of the population: cultivating of cereals and breeding of cattle. The conclusion is made about changing of the sorcerous functions in agriculture under impact of modernization of society beginning from 1930th. As the result, there is a gradual narrowing of the sorcerous functions during the middle – the second half of the 20th century and persisting in sorcerous competence only curing of illnesses, which, reputedly, don't treat by official medicine.
РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ